**Урбан, В. В.** Глаголіца / В. В. Урбан // Культура Беларусі : энцыклапедыя. Т. 3. / рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П.Броўкі, 2012. – С. 49.

**ГЛАГО́ЛІЦА** (ст.-слав. *глаголъ* 'слова'), адна з першых старажытных славянскіх азбук, якая выкарыстоўвалася паралельна з кірыліцай. І глаголіца, і кірыліца адпавядалі тагачаснай фанетычнай сістэме стараславянскай мовы. Абедзве азбукі мелі амаль аднолькавую колькасць літар (у глаголіцы было 40 літар, у кірыліцы – 43), а таксама аднолькавы парадак іх размяшчэння. Адрозненні заключаліся ў форме літар: кірылічныя літары мелі простую і выразную форму, лёгкую ў напісанні; літары глаголіцы былі складаныя, замыславатыя (з разнастайнымі кружочкамі, пяцелькамі і пад.) і цяжкія ў напісанні. Пытанне аб паходжанні глаголіцы і кірыліцы, а таксама паслядоўнасці іх ўзнікнення да гэтага часу застаецца не вырашаным. Па меркаваннях некаторых вучоных, глаголіцу стварыў славянскі асветнік Кірыл (Канстанцін-Філосаф). Найбольшае выкарыстанне глаголіца атрымала ў 60-х гадах IX ст. у Маравіі. У якасці алфавіта глаголіца шырока ўжывалася да канца XVIII ст. у Балгарыі і Харватыі (куды яна пранікла з Маравіі). Глаголіца ў якасці азбукі ва ўсходніх славян шырокага распаўсюджання не атрымала і ўжо ў XI ст. была выцеснена кірыліцай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ